Прал… краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 13 (137) Серада, 18 красавіка 1990 года

## ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ

Кожны край мае сваю непаўторную, цікавую гісторыю, а таксама людзей, якія яе стваралі і самі сталі часткаю гісторыі. Лепшыя з іх шырока вядомы ды ўшанаваны далёка за межамі малой радзімы. І калі людзі сталага ўзросту бачаць у Аляксею Нічыпаравічу Карпюку толькі сучасніка, які заўсёды быў побач, які ў іх на вачох дасягнуў цяперашняга пачэснага месца ў беларускай літаратуры, то для нашага пакалення маладых — ён больш чым вядомы пісьменнік.

З Аляксеем Нічыпаравічам звязана апошняя паўвекавая гісторыя Гродзеншчыны. І гэтае трэба знарок падкрэсліць, бо іншыя месцы проста ведаюць добрага пісьменніка Аляксея Карпюка, а тут пачынаючы ад партызанскага руху, і па сённяшні дзень, ён так ці інакш удзельнічае ў нашым жыцці. Ужо не адно пакаленне юнакоў і дзяўчат плакала над аповесцю «Данута». Мы купляем у кнігарнях новыя і новыя кнігі пісьменніка, а потым сустракаем Аляксея Нічыпаравіча на вуліцы. І нельга не заўважыць бадзёрую, надзвычай адметную постаць славутага земляка. Мы з задавальненнем запрашаем яго на сустрэчы, дзе пісьменнік гаворыць цікава, раскована і па-чалавечы звычайна. Але жывучы побач, у адным горадзе, усё ніяк не звыкнемся з яго прысутнасцю — і ва ўяўленнях і ў натоўпе, заўсёды адшукаем відную постаць.

Віншуючы Аляксея Нічыпаравіча з 70-годдзем і жадаючы яму здароўя ды новых творчых поспехаў, не зычым спакойнай, нецікавай прышласці. Мы толькі хочам, каб не здараліся ў жыцці пісьменніка несправядлівасці, якія ён мужна перамагаў, сцвярджаючы праўду ў самыя непраўдзівыя часы.

**Літаб ́яднанне**
**«Наднёманскія галасы».**

*На парадак дня*

## ВЫРАШАЦЬ РАЗАМ

Звярнуцца да гэтай тэмы мяне прымушае тое становішча, якое зараз склалася ў ВНУ, у тым ліку і ў нас, а менавіта — нарастаючыя негатыўныя адносіны студэнтаў да грамадскіх навук. Праблема гэта ўзнікла не сёння і не ўчора. Але ва ўмовах усеагульнага маўчання аб ёй доўгі час не ўспаміналі. І вось, здаецца, «справа» зварухнулася з мёртвай кропкі.

Сёння ўжо ніхто не скрывае, што ў сістэме грамадскіх навук патрэбна перабудова, і добра, што яна пачалася. Прыклады таму — з ́яўленне новых падручнікаў па палітэканоміі і філасофіі, некаторыя змяненні вучэбных праграм. Удзельнікі студэнцкага форума ў Маскве прапанавалі Дзяржкамітэту народнай адукацыі адмяніць дзяржаўны экзамен па адной з чатырох магчымых дысцыплін. І камітэт аператыўна адрэагаваў на прапанову, выдаўшы загад: «Аб перабудове грамадскіх навук у вышэйшых навучальных установах краіны». Чым было вызвана змяненне ў вучэбных планах? Звернемся да сацыялагічных даследаванняў, праведзеных сярод моладзі нашай краіны: 19% студэнтаў сцвярджалі, што наша мінулае было эпохай падману, ланцугом трагічных падзей, якія завялі краіну ў тупік. Толькі 8(!)% юнакоў і дзяўчат пацвердзілі веданне гісторыі свайго народа, сваёй краіны, рэспублікі. Для астатніх гэта толькі фрагменты: эпоха Сталіна, эпоха Хрушчова. А нейкага-небудзь цэласнага малюнка няма. Па майму разуменню, гэтыя лічбы і факты паказваюць нежыццяздольнасць выкладання грамадскіх дысцыплін у недалёкім мінулым.

Трэба сказаць, што агонь грамадскай крытыкі прыйшоўся, у асноўным, на такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм і палітэканомія сацыялізма. Агонь такі моцны, што сёння пытанне ставіцца ўжо не аб якасці выкладання, не аб аб ́ектыўнасці інфармацыі, а — ці патрэбна выкладанне грамадскіх навук у вышэйшай школе ўвогуле.

Загад ёсць, але, як бачым, праблема на гэтым не вырашаецца. Агульны настрой у студэнцкім асяроддзі цудоўна і яскрава сведчыць аб гэтым: пустыя аудыторыі на лекцыях, вялыя семінарскія заняткі, — актыўнасць студэнтаў абуджаецца толькі ў час сесіі, калі яны пачынаюць здаваць залікі ці экзамены. На працягу ўсяго семестра прадмет ігнаруецца, а ў перыяд сесіі як-ніяк пераадольваецца апошні рубеж, і на гэтым студэнт забывае аб сваіх перажываннях...

Што рабіць? Як пераадолець адчужанасць студэнтаў ад палітэканоміі, філасофіі і г. д. — гэтае пытанне хвалюе і выкладчыкаў, і студэнтаў. Неаднойчы пытанне падымалася на пасяджэннях Вучонага савета універсітэта. І зусім нядаўна, на апошнім пасяджэнні, пытанне было ў сіле, але ці па той прычыне, што яно стаяла ў самым канцы на парадку дня, ці па другой якой-небудзь — абмеркавання не было.

Як бачым, праблема застаецца. Можа быць, трэба ўвесці гібкую сістэму залікаў і экзаменаў у залежнасці ад актуальнасці курса. Ці, напрыклад, на арганізацыйных занятках у пачатку семестра студэнтам разам з выкладчыкамі (добра, што такое права існуе) абмеркаваць тэматыку лекцый і семінараў, саму форму правядзення заняткаў, той жа парадак залікаў і г. д.

Не ведаю, можа, каго-небудзь не задаволіць мая прапанова, але я прызываю да шырокай дыскусіі ў газеце, на кафедрах, з удзелам студэнтаў, на факультэтах па гэтай складанай праблеме.

**Н. БЕДЗЬ.**

# У нас—Дзень донара







У Расіі адбылася страшная катастрофа. Н. А. Бердзяеў: «Тщетны оказались надежды, что революция раскроет в России человеческий образ, что личность человеческая поднимается во весь свой рост после того, как падает самовластье. Слишком многое привыкли у нас относить на счет самодержавия, все зло нашей жизни хотели им объяснить. Нет уже самодержавия, а русская тьма и русское зло остались».

Я нездарма спачатку прывяла словы Бердзяева, таму што яны вельмі актуальныя ў наш час. У ходзе работы сваёй, ды і ў жыцці ўвогуле не раз даводзілася сутыкацца з бяздушнасцю, грубасцю, пасіўнасцю людзей. Возьмем, напрыклад, дні донара ў нашым універсітэце.

Раней, у часы адміністратыўнага камандавання, пытанне аб донарстве вырашалася працай. У нашы дні кожны рашае сам за сябе. Таму з 2611 студэнтаў на донарскі пункт здаць бязвыплатна кроў прыйшлі толькі 115 чалавек.

Вельмі неахвотна ідуць студэнты на донарскі пункт. Вядома, хвалюе іх і магчымасць заражэння СНІДам, але я, як медык, павінна сказаць, што сістэмы для забору выкарыстоўваюцца толькі аднаразавага ўжывання. А адданая донарам кроў аднаўляецца праз 48 гадзін. Вядома, у нас яшчэ вельмі малая плата за кроў. І ў сувязі са свабодным наведваннем заняткаў не прыцягвае і спраўка, вызваляючая ад заняткаў на два дні. Але дзе ж абавязак, дзе гатоўнасць прыйсці на дапамогу хвораму? Проста бязвыплатна, па-чалавечы.

А кроў усё ж патрэбна, і нават у вялікай колькасці. Разумеюць гэта такія студэнты, як Тукальская Тамара, Лаўнік Аляксандр, Губін Сяргей, Рубцэвіч Васіль, Ярашук Іван, Назарка Іна, Белуш Наталля (матэматычны факультэт), Волах Аляксандр, Конюх Аляксандр, Махнач Віктар, Кавалёнак Андрэй, Кушчанкова Ала, Заўялаў Ігар (фізічны факультэт). Яны за гады сваёй вучобы ва універсітэце здалі кроў па 6—8 разоў. Вялікае ім дзякуй!

Таксама хочацца сказаць словы падзякі студэнтам 4 курса біялагічнага факультэта і слухачам падрыхтоўчага аддзялення, якія вельмі дружна прыйшлі на донарскі пункт без усялякіх угаворванняў.

Вялікае дзякуй усім студэнтам, якія разумеюць важнасць справы і здаюць кроў. Будзем спадзявацца, што іх колькасць павялічыцца ў нашым універсітэце.

**С. ЕЎМЕНЧУК,**
**фельчар здраўпункта.**

**Не першы раз добраахвотна прыйшлі на донарскі пункт здаць кроў Святлана Лапута, студэнтка 3 курса 3 групы філалагічнага факультэта (верхні здымак) і Марыя Кісель, студэнтка І курса І групы фізічнага факультэта (сярэдні здымак).**

**А доктар Іван Іванавіч Урублеўскі размаўляе з донарамі Таццянай Яцко (І курс І група фізфака) і Наталлей Хамчук (3 курс 3 група філфака).**

**Фота У. САРОКІНА.**

*Па матэрыялах гадавога сходу работнікаў вышэйшай школы ў Маскве*

# АБ ´ЕКТ УВАГІ — НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

**А. І. Васкабоеў удзельнічаў у рабоце гадавога сходу работнікаў вышэйшай школы ў Маскве па праблемах навукова-даследчай дзейнасці.**

**— Так, пытанні вырашаліся вельмі важныя, — адзначыў Аляксандр Іванавіч. — Асноўныя вывады, палажэнні, задачы змешчаны ў канцэпцыі, прынятай на сходзе. Аснову ж канцэпцыі складае палажэнне аб тым, што паскоранае развіццё навукі ў ВНУ забяспечыць рэзкі прырост і павысіць узровень навуковай прадукцыі ў краіне, узмацніць канкурэнцыю ў навуковым комплексе, акажа істотнае ўздзеянне на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і эфектыўнасць народнай гаспадаркі.**

## З КАНЦЭПЦЫІ ПЕРАБУДОВЫ І РАЗВІЦЦЯ НАВУКІ Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ ВА ЎМОВАХ РАДЫКАЛЬНАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ РЭФОРМЫ

**Ацэнка стану навукі ў ВНУ і асноўныя фактары, стрымліваючыя яе развіццё.**

Слабасць сацыяльнага заказу на навуковыя вынікі, задавальненне малым у галіне тэхнікі і тэхналогіі з боку галіновых міністэрств і прадпрыемстваў абумовілі ў канчатковым выніку інэртнасць у самой навуцы, парадзілі псіхалогію абмежаванай карыснасці працы вучоных ВНУ.

Жорсткая арганізацыя, цэнтралізацыя, манапалізацыя, адміністрыраванне кіравання навукай, падрабязнае планаванне і празмерная рэгламентацыя фундаментальных і пошукавых даследаванняў у ВНУ, ігнараванне патрабаванняў дэмакратызацыі ў навуцы, вызначэнне на аснове дырэктыўных і валявых рашэнняў канкрэтных тэрмінаў атрымання вынікаў фундаментальных даследаванняў у цэлым па праблемах і нават іх этапаў сталі стрымліваючымі фактарамі развіцця навукі ў ВНУ, прычынай кан´юнктуры ў навуковых калектывах, пагоні за вокамгненнымі вынікамі.

НАВУКА У ВНУ — БАЗІС ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Базісны характар навукі ў сучаснай ВНУ патрабуе ад выкладчыка быць перш за ўсё вучоным, даследчыкам, што толькі і даказвае яго права на выкладчыцкую работу. Адсюль неабходнасць павышанай увагі і кардынальнага змянення адносін да навуковых вынікаў прафесарска-выкладчыцкага саставу. Уклад у навуку становіцца рашаючым фактарам ацэнкі патэнцыялу педагога, допуску яго да выкладчыцкай работы.

**Вышэйшая навучальная ўстанова — адзіны вучэбна-навуковы комплекс.**

Канцэпцыя прадугледжвае пераадольванне адасобленасці навукова-даследчых і вучэбных падраздзяленняў, навуковых работнікаў і выкладчыкаў ВНУ, стварэнне якасна новай асновы для ўзаемадзейнасці навуковага і вучэбнага працэсу, іх інтэнсіўнага ўзаемаабагачэння.

**Міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва і развіццё знешніх эканамічных сувязей**

Паскоранае развіццё знешнеэканамічнай дзейнасці, умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва з ВНУ, арганізацыямі і фірмамі замежных краін вызначаецца як важнейшае канцэптуальнае становішча. Выхад на міжнародны ўзровень — адзін з найбольш эфектыўных сродкаў стымулявання навукі ў ВНУ, аб´ектыўнай ацэнкі дасягнутых вынікаў і ўзроўню даследаванняў.

**Новыя метады фінансавання і гаспадарання ў ВНУ**

Навуковыя арганізацыі краіны павінны валодаць роўнымі ўмовамі для функцыяніравання не толькі ў параўнанні адна з адной, але і ў параўнанні з астатнімі звеннямі народна-гаспадарчага комплексу краіны.

Галоўныя крытэрыі эфектыўнасці работы навуковых калектываў у ВНУ: узровень і аўтарытэт спецыялістаў, якіх рыхтуе ВНУ, дасягненне вышэйшага як айчыннага, так і сусветнага ўзроўняў у развіцці новых ведаў, стварэнне канкурэнтаздольнай новай тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў (як якасны паказчык), а таксама прыбытак або даход (як эканамічны паказчык).

**Дэмакратызацыя і гуманізацыя навукі ў ВНУ**

Важная ўмова — падрыхтоўка ў ВНУ новага маладога пакалення даследчыкаў, пастаянная работа з моладдзю, станаўленне асобы, падтрымка таленавітых студэнтаў і аспірантаў. Неабходна аднаўленне ў краіне прэстыжу кампетэнтнага вучонага-прафесіянала, каштоўнасці навуковых ведаў.

АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПЕРАБУДОВЫ НАВУКІ Ў ВНУ І ШЛЯХІ ІХ ВЫРАШЭННЯ

**Парытэт у арганізацыі і забеспячэнні навуковых даследаванняў**

Узрастанне ролі навукі ў ВНУ павінна быць забяспечана ўмовамі парытэту асноўных звенняў айчыннай навукі, пры якіх навуковыя арганізацыі ВНУ на роўных, на конкурснай аснове прыцягваюцца да вырашэння задач, фінансуемых са сродкаў дзяржаўнага бюджэту, дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, комплекснай праграмы НТП краін — членаў СЭУ на перыяд да 2000 года, планаў міжгаліновых навукова-тэхнічных комплексаў.

**Уклад вучоных ВНУ у вырашэнне прыкладных задач развіцця народнай гаспадаркі**

Галоўная задача — стварэнне па-сапраўднаму канкурэнтаздольнай, навукаёмкай прадукцыі, для якой характэрна высокая сацыяльна-эканамічная патрэба. Формай яе рэалізацыі могуць быць як прыкладныя распрацоўкі, так і кансультацыйныя паслугі па прамых заказах прадпрыемстваў і арганізацый, грамадскіх арганізацый, савецкіх органаў. Кансультыраванне прадпрыемстваў і арганізацый па эканамічных, сацыялагічных, юрыдычных і іншых пытаннях павінна стаць дадатковым каналам сувязі грамадазнаўцаў з жыццём і ўзмацнення іх уздзеяння на вырашэнне практычных задач перабудовы.

**Развіццё навукова-вытворчай дзейнасці**

Вынікамі навукова-вытворчай дзейнасці з´яўляюцца разнастайныя віды паслуг, якія выконваюцца ВНУ з выкарыстаннем унікальнай навуковай апаратуры як у лабараторных, так і ў палявых умовах; інфармацыйнае, патэнтна-ліцэнзійнае абслугоўванне навуковых калектываў, іншыя паслугі навукова-вытворчага характару.

**Інфарматызацыя навукі ў ВНУ**

Яна ў значнай меры вызначаецца агульнай канцэпцыяй інфарматызацыі грамадства, якая сёння распрацоўваецца. Канчатковая мэта — мэтанакіраванае фарміраванне і развіццё інфармацыйнай інфраструктуры ВНУ і ўмоў яе выкарыстання ў вучэбным працэсе і НДР.

**Эканамічны механізм арганізацыі навуковых даследаванняў у ВНУ**

Сярод асноўных напрамкаў перабудовы і развіцця эканамічнага механізму — пытанні налогаабкладання, выкарыстанне розных форм уласнасці, развіццё ў інтарэсах навукі ВНУ банкаўска-крэдытнай сістэмы і фарміраванне навуковых фондаў, павышэнне гаспадарчай самастойнасці і эканамічнай адказнасці ВНУ, авалодванне навыкамі таваравытворцаў навукова-тэхнічнай прадукцыі і ўмовамі яе рэалізацыі на айчынным і замежным рынках.

Дыферэнцыяцыя налогаў павінна адлюстроўваць агульны аб´ём выконваемых работ, які для ВНУ з аднолькавым патэнцыялам можа значна адрозніваецца: льготы павінны распаўсюджвацца ў большай ступені на тыя ВНУ, навукова-тэхнічная прадукцыя якіх адпавядае сусветнаму ўзроўню і перавышае яго, якія рэалізуюць створаную імі новую тэхніку і матэрыялы на замежным рынку, на валютнай аснове, пастаўляюць на айчынны рынак навукаёмкую прадукцыю, якая забяспечыць эканомію валютных сродкаў за кошт адказу ад імпартных закупак: павышаныя льготы павінны быць прадугледжаны для тых ВНУ, якія выкарыстоўваюць у поўнай меры сродкі фонда навукова-тэхнічнага патэнцыялу, на вырашэнне сацыяльных задач; важным стымулам павінна з´яўляцца адлічванне часткі прыбылі (даходу) на правядзенне фундаментальных і пошукавых даследаванняў.

**Упраўленне навукай у вышэйшай школе**

а) перабудова сістэмы ўпраўлення навукай у вышэйшай школе павінна праходзіць у напрамку дэцэнтралізацыі, дэмакратызацыі, дэманапалізацыі, рэалізацыі прынцыпаў самакіравання навуковых арганізацый ВНУ, спалучэння функцый дзяржаўнага рэгуліравання і гаспадарчай самастойнасці, развіцця супрацоўніцтва ВНУ, тэхнікумаў, вучылішч і школ у рамках адзінай сістэмы бесперапыннай адукацыі з улікам рэспубліканскіх і рэгіянальных асаблівасцей.

б) сістэма ўпраўлення навукай ВНУ на саюзным і рэспубліканскіх узроўнях павінна развівацца па наступных прынцыпах:

— вызначэнне абмежаванай групы задач;

— усё, што можа вырашаць ніжэйстаячы орган, перадаецца на гэты ўзровень упраўлення;

— не дапускаць дубліравання функцый розных органаў упраўлення.

в) сістэма ўпраўлення павінна быць арыентаванай на якасна структурную перабудову сектара навукі ВНУ.

**Заключэнне**

Канцэпцыя распрацавана з улікам рэальных умоў і тэмпаў развіцця народнагаспадарчага комплексу краіны, тых якасных змяненняў, якія звязаны з далейшым удасканаленнем эканамічнага механізму, укараненнем тэрытарыяльнага дзяржразліку і самакіравання саюзных рэспублік.

Яе рэалізацыю прадугледжваецца ажыццявіць у два этапы.

На першым этапе, у 1990—1992 гадах, сектар навукі ВНУ павінен завяршыць перабудову і заняць належнае месца ў складзе навукова-тэхнічнага комплексу краіны, стаць паўнапраўным членам універсітэцкай навукі і міжнародных навуковых цэнтраў.

На другім этапе, 1993—2000 гадах, па выніках праведзеных пераўтварэнняў у эканоміцы краіны вышэйшая школа атрымае паскоранае развіццё.

ВНУ павінны стаць буйнымі вучэбна-навуковымі і культурна-выхаваўчымі цэнтрамі з развітай навукова-вытворчай інфраструктурай і ўмовамі для практычнай рэалізацыі адзінага творчага працэсу распрацоўкі, стварэння новаўвядзін, забеспячэння на гэтай аснове падрыхтоўкі спецыялістаў, адказваючых высокім патрабаванням навукова-тэхнічнага прагрэсу.

# 150 гадоў



*Цікавыя звесткі з біяграфіі Багушэвіча, вытрымкі з яго цудоўных твораў зацікавілі слухачоў. Узнёслыя і пранікнёныя, простыя і сардэчныя словы літаратуразнаўцы Генадзя Кісялёва і мовазнаўцы Івана Крамко, супрацоўнікаў АН БССР (на здымку) аб нацыянальным беларускім паэце даходзілі да сэрца кожнага, хто прысутнічаў на вечары.*



# «Усім будзе чутка...»

ФРАНЦІШАК Багушэвіч увайшоў у беларускую літаратуру як адзін з яе найбольш таленавітых пачынальнікаў, як аўтар двух паэтычных зборнікаў, як заснавальнік нацыянальнай прозы, таленавіты і прагрэсіўны публіцыст. Рэфарматар у галіне вершаскладання, шчыры дбайца пра пашырэнне выразных магчымасцей літаратурнай мовы, абаронца прэстыжу «мужыцкай» літаратуры — гэта таксама Багушэвіч, гэта яго штодзённы клопат, яго мастакоўскае крэда.

Паэзія Багушэвіча такая ж бескампрамісная, як і сам яе стваральнік. Індывідуальны свет пісьменніка — гэта свет, у якім рэчаіснасць змадэлявана па прынцыпу рэзкіх маральных кантрастаў: дабро і зло, праўда і крыўда, беднасць і багацце, адухоўленасць і бяздумнае марнаванне жыцця. Лірычны герой паэта заўсёды бедны, але ён не толькі пакутуе і скардзіцца, ён ганарыцца сваёй чалавечай нязломнасцю, выратоўваецца адчуваннем уласнай годнасці.

Паэт разбураў складзены і афіцыйна прапагандуемы міф пра «забітасць» беларускай вёскі, абуджаў у селяніне чалавека і беларуса. «Мова наша ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая,» — гэта не толькі пра мову гаворыцца, гэта пра самаадчуванне цэлай нацыі, гэта наперакор спрадвечнаму комплексу нацыянальнай непаўнацэннасці. «Наша мова для нас святая, бо яна нам ад бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым мы ёю шмат добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахвотней гавораць па-французску, як па-свойму».

Шукаючы вытокі сялянска-беларускай прыніжанасці, да вышынь высокай эстэтыкі ўзнімаючы непаўторнасць то пяшчотнай, то рэзкай «гаворкі», Багушэвіч сілай мастацкай прадбачлівасці пераадолеў бар´еры часу, прыйшоў са сваім клопатам непасрэдна да нас, каб на новым павароце нацыянальнай гісторыі з асаблівай сілай ажыло яго паэтычнае і публіцыстычнае слова.

Багушэвіч — паэт, для якога нібы не існавала другарадных дэталяў. Апісанне сялянскай хаты, элемент мужыцкай вопраткі, мазоль на спрацаваных руках — усё ператваралася ў паэтычны сімвал, станавілася штуршком для шырокіх абагульненняў. На жаль, і сёння яшчэ можна пачуць выказванні пра сціпласць і праставатасць сялянскай музы беларускага паэта. Але не трэба забываць на тое, што праставатасць ніколі не караецца такой высокай мераю, як поўная забарона друкавання, і ніхто не будзе судзіць прыземлены, сціплы талент праз восем гадоў пасля смерці самога аўтара. Суд, які распачала над «Дудкай беларускай» Пецярбургская судовая палата ў 1908 годзе, — гэта ўнікальны для гісторыі суд і адно з самых непасрэдных сведчанняў вышэйшага ідэйна-мастацкага гатунку, у якім выкананы верш нашага песняра.

Цікава, што першыя чытачы (а вельмі часта нават слухачы) Багушэвічавых вершаў вельмі добра зразумелі асноўны пафас паэтавых выступленняў. Не спакушаныя ў прыгожым пісьменстве, а часта і зусім не адукаваныя, яны тым не менш за дзесяць кіламетраў неслі ў 1900 годзе нябожчыка на ўласных руках і, што самае галоўнае, да нашага часу захавалі поўныя павагі і чараў легенды пра добрага адваката-заступніка і свайго паэта.

9 сакавіка 1990 года споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта, а 15 красавіка — 90 год па яго смерці. Жывучы паміж двума юбілеямі Багушэвіча, удзячная беларуская грамадскасць са шчырай павагай згадвае імя вялікага песняра.

**Н. ТАРЭЛКІНА,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

## З дня нараджэння паэта

# ЧАЛАВЕК ЧУЛАГА СЭРЦА

Дваццаць першага сакавіка споўнілася 150 год з дня нараджэння адной з самых яркіх і каларытных фігур у беларускай культуры і літаратуры XIX ст., паэта-дэмакрата Францішка Багушэвіча.

З біяграфіі Багушэвіча вядома, што ён вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, у паўстанні 1863 г. А пра адзін з момантаў біяграфіі Багушэвіча — працы яго ў якасці следчага — расказвае Васіль Хомчанка ў аповесці «Пры апазнанні — затрымаць». Гэты твор у беларускай літаратуры новы, таму што гэта першы твор, у якім разглядаецца біяграфія Багушэвіча. Твор цікава чытаецца, вядзе за сабой чытача, хаця ў ім ёсць недакладнасць, супярэчнасці з гісторыяй, ды і сам аўтар у асобных момантах супярэчыць сабе. Але твор заслугоўвае ўвагі.

Што гэта была за асоба — Францішак Багушэвіч? Як пачыналася яго творчасць? Як адносіўся ён да людзей, з якімі даводзілася сустракацца на службе і ў жыцці? Адказы дае аповесць.

Гэтага чалавека з пышнымі шляхецкімі вусамі, спакойнага і цвёрдага ў сваіх меркаваннях, вельмі любілі людзі, асабліва простыя сяляне. Чалавек чулага сэрца і дэмакратычных перакананняў, Багушэвіч з выключнай увагай ставіўся да разгляду кожнай справы, якая датычылася простага працоўнага чалавека. Нездарма Багушэвіча называлі мужыцкім адвакатам. Ён падыходзіў да падсуднага не як да злачынцы, а як да чалавека, ставіў сябе на яго месца. Ён чула адносіўся да злачынцаў, бо ведаў, што не толькі людзі павінны ў тым, што яны зрабілі, часцей вінавата жыццё, умовы, у якіх яны жывуць. Багушэвічу па характару службовай дзейнасці даводзілася непасрэдна сутыкацца з інтарэсамі і патрэбамі народа. У судовых спрэчках сялян з памешчыкамі адвакат Багушэвіч часта адкрыта ставіўся на бок сялян.

Глыбокая дума аб лёсе народа і роднай краіны неадступна хвалявала яго. Гарачую і бескарыслівую любоў да радзімы і народа, да простых людзей працы Багушэвіч пранёс праз усё сваё жыццё.

Багушэвіча ўвесь час турбуе праблема беларускай мовы, беларускай народнасці. Адносіны Багушэвіча да мовы В. Хомчанка выказаў словамі, узятымі з верша паэта:

Ой, нашто ж мне дана тая мова,  
Як я не ўмею сказаць тое слова,  
Каб яго пачулі, каб яго пазналі,  
Каб яго, то слова, ды праўдай назвалі,  
Каб і разышлося то слова па свеце,  
Як праменні сонца, цёплага ў леце;  
Каб на тое слова ды людцы зрадзелі  
Так, як тыя дзеткі на святой нядзелі;  
Каб жа тое слова ды людцоў з'яднала,  
Каб на тое слова ворагаў не стала;  
Каб людцы прызналі братоў ды братамі...

Не пашкодзіла б і нам задумацца над гэтымі словамі, напісанымі больш ста гадоў назад таленавітым паэтам Францішкам Багушэвічам.

**М. ПІСАРУК,**
**студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта.**

* * *

*Чыталі на вечары шматлікія вершы Францішка Багушэвіча і гэтыя дзяўчаты-першакурсніцы, якіх вы бачыце на здымку. Вядома, хваляваліся, але ж былі і радасныя хвіліны, калі дружна апладзіравалі ім усе тыя, хто прысутнічаў у зале. Ды і не ў гэтым, нарэшце, галоўнае. У час падрыхтоўкі да вечара ўшанавання паэта яны яшчэ раз блізка дакрануліся сэрцам да такіх цёплых, пранікнёных радкоў...*

*...Цяпер зраблю дудку*  
*Ад жалю, ад смутку.*  
*Га! Зраблю ж другую,*  
*Жалейку смутную, —*  
*Ды каб так заграла,*  
*Каб зямля стагнала,*  
*От каб як заграла:*  
*Каб слязьмі прабрала,*  
*Каб аж было жудка,*  
*От-то мая дудка!...*

* * *



# ЖЫЦЬ ПАЭТУ Ў ВЯКАХ...

Ні на хвіліну не спыняецца імклівы цягнік жыцця. Адна падзея змяняецца другой, і часам можа здарыцца так, што менавіта нейкая нязначная на першы погляд падзея акрыліла цябе, узняла на вышэйшую ступень. А ўзняўшыся на такую ступень, чалавек пачынае заўважаць тое, чаго раней не бачыў і не разумеў.

Вялікую ролю ў нашым жыцці адыгрывае мастацтва. Нібы ясны прамень, асвятляе нам дарогу ў жыццё. Мастацтва нішто не зможа замяніць, сцерці. Яно вечна будзе жыць у сэрцах тых, хто яго стварыў і творыць сёння.

Выдатны беларускі паэт Францішак Багушэвіч усё сваё жыццё прысвяціў мастацтву. Ён быў вельмі значнай і яркай фігурай у гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Таленавіты паэт, публіцыст, празаік, ён увайшоў у беларускую літаратуру як заснавальнік крытычнага рэалізму, першы буйны нацыянальны, народны пісьменнік, перакананы і паслядоўны дэмакрат, абаронца прыгнечаных і абяздоленых.

І вось ужо 150 год мінула з дня нараджэння Ф. Багушэвіча.

У сценах нашага універсітэта прайшоў вечар, прысвечаны гэтай даце. Гарачыя словы публіцыста гучалі са сцэны, і хоць гаварыў іх не сам Багушэвіч, а нашы студэнты, не пакінулі яны абыякавымі прыхільнікаў паэзіі. Прысутнічалі тут і госці са сталіцы — літаратуразнаўца Генадзь Кісялёў і мовазнаўца Іван Крамко. Яны таксама прынялі ўдзел у нашым вечары. На першы погляд — звычайныя людзі. Але як перакананa, праўдзіва гавораць яны пра тое, што здаецца вядомым, рэальным, паколькі добра ведаюць жыццё, справу, якой прысвяцілі сябе.

Змітрок Бядуля гаварыў: «Праз слёзы і смех, праз гнеў і абурэнне, праз нянавісць да разнастайных эксплуататараў беднага сялянства і праз любоў да пакрыўджанага вякамі беларускага народа мы бачым і адчуваем у творах Багушэвіча гарачае, чэснае, адзыўлівае сэрца паэта-мастака, паэта-свабодалюбца».

Незалежна ад таго, у якім стагоддзі жыве чалавек, але калі ён разумее мастацтва, то разумее і жыццё. І менавіта з твораў Ф. Багушэвіча мы пачынаем заўважаць прыгажосць наваколля, адчуваць адказнасць за даручаную справу, адчуваць сябе свядомым грамадзянінам рэспублікі.

І доўга яшчэ палымянаму слову паэта жыць у вяках.

**А. ПЯШКО,**
**студэнтка І курса філалагічнага факультэта.**

*СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ*

# Крэўскі замак

У 1988 і 1989 гадах працавалі ў археалагічным будаўнічым атрадзе «Спадчына» на базе гістфака. Нам пашанцавала пазнаёміцца з Крэўскім замкам — адным з самых адметных помнікаў архітэктуры на Беларусі.

Кожны дзень пасля раскопак рупліва збіралі звесткі пра замак, яго гісторыю, людзей, лёсы якіх былі звязаны з ім.

Крэўскі замак паўстаў у тыя трывожныя часы, калі нашаму народу, краю пагражалі заваёўнікі з Захаду — рыцары Лівонскага Ордэну. Неаднаразова пакідалі пасля сябе смерць і разбурэнні на землях Беларусі і Прыбалтыкі. Але з кожным разам усё мацней і мацней было супраціўленне жыхароў Вялікага Княства Літоўскага — агульнай радзімы беларусаў, літоўцаў, украінцаў.

Каб зачыніць крыжакам шлях у глыб земляў княства, былі пабудаваны шматлікія абарончыя ўмацаванні на асноўных напрамках варожай пагрозы — замкі ў Гродне, Навагрудку, Лідзе, Вільні і г. д.

У даліне паміж высокіх пагоркаў, ля злучэння рачулак Крэвянкі і Шляхцянкі па загаду Вялікага князя Гедыміна ў 30-я гады XIV стагоддзя паўстаў мураваны замак. Тады тут кіраваў сын вялікага князя — князь Альгерд. Што тычыцца планіроўкі замка, то па форме ён — няправільная трапецыя. З усходу, поўдня і часткова з захаду і поўначы замак прыкрывалі воды Крэвянкі і Шляхцянкі, перагароджаных плацінаю. Замак меў усяго 2 вежы, размешчаныя па дыяганалі. У паўночна-заходняй частцы замка знаходзілася Вялікая (Княжацкая) вежа. Тут жылі князь, яго чэлядзь і начальнік замкавай варты. А ў паўднёва-сходняй частцы замка была Малая вежа. На іх долю выпаў цяжкі лёс. Пад час 1-й сусветнай вайны, калі лінія фронту праходзіла на Смаргоншчыне, кайзераўскія войскі збудавалі ў Малай вежы дот, які доўгі час знаходзіўся пад абстрэлам рускай артылерыі. У выніку ад вежы амаль нічога не засталося. Княжацкую вежу пашкодзілі не менш, хоць яна таксама была моцна разбурана.

Аднак вернемся зноў да гісторыі. Крэўскі замак быў сведкам многіх гістарычных падзей. Акрамя нападкаў войскаў швецкіх каралёў, маскоўскіх цароў, татарскіх ханаў, крыжакаў замак зведаў і міжкняжацкую барацьбу за ўладу. Так, у 1382 годзе ў Княжацкай вежы быў задушаны па загаду Ягайлы яго дзядзька Кейстут — прэтэндэнт на вялікакняжацкі трон. Згодна легендзе, сын Кейстута Вітаўт, пераапрануўшыся ў жаночую вопратку, здолеў уцячы з замка і распачаў барацьбу са сваім стрыечным братам Ягайлам. Спачатку поспех быў на баку апошняга. Больш таго, 10 жніўня 1385 года ў Крэўскім замку была падпісана вунія паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай, накіраваная супраць княжацкай навалы.

Ажаніўшыся ў выніку вуніі з польскай каралевай Ядзвігай, Ягайла становіцца адначасова вялікім князем літоўскім і польскім каралём. Але Вітаўт не думаў складаць зброі, і барацьба працягвалася да 1392 года, калі ў Остраве каля Ліды паміж братамі было падпісана пагадненне, згодна якому Ягайла застаўся каралём Польшчы, а Вітаўт становіцца вялікім князем Літоўскім. Братам яшчэ неаднаразова прыходзілася браць у рукі зброю, але ўжо ніколі яны не скіравалі яе адзін супраць аднаго. У бітве пад Грунвальдам, дзякуючы ўзгодненым і рашучым дзеянням Ягайлы і Вітаўта, мужнасці іх падначаленых, крыжакі былі цалкам разбіты.

З кожным годам замак страчваў сваё абароннае значэнне, паступова разбураўся. Цяпер неабходна аднавіць спачатку хоць бы Княжацкую вежу. Плануецца ў будучыні зрабіць тут мясцовы музей. Неабходна вярнуць гістарычную памяць беларускаму народу.

**У. КАНАНОВІЧ,**
**студэнт гістарычнага факультэта.**

**СПОРТ**

## ЭКРАН СПАБОРНІЦТВАЎ

27—28 сакавіка адбыўся асабіста-камандны турнір па класічнай барацьбе ў праграме спартакіады ВНУ.

У асабістым заліку ў парадку вагавых катэгорый пераможцамі першынства універсітэта сталі: Павел Базыльчык (матэматычны факультэт), Яўген Буйко (юрыдычны факультэт), Віталь Радзюк (фізічны), Міхаіл Бандарэнка (біялагічны), Вадзім Лакіза (гістарычны), Міхаіл Сямёнчык (гістарычны), Сяргей Ключко (юрыдычны), Ігар Палыка (юрыдычны), Сяргей Шэўчык (матэматычны факультэты).

Камандную перамогу атрымалі правазнаўцы. На другім месцы — студэнты гістарычнага факультэта, на трэцім — прадстаўнікі фізічнага факультэта.

30 сакавіка ў стралковым ціры прайшло асабова-каманднае першынства па пулявой стральбе ў праграме спартакіады. Адразу тры ўдзельнікі спаборніцтваў выбілі па 46 ачкоў. Адпаведна правілам спаборніцтваў, першае месца заняла Святлана Шышко (юрыдычны факультэт), другое месца ў Генадзя Юрэвіча (гістарычны факультэт), трэцяе — у Наталлі Шэлудзько (філалагічны факультэт).

Агульнакамандную перамогу атрымалі правазнаўцы, другое месца — у студэнтаў філалагічнага факультэта, на трэцяй ступені п'едэсталу — каманда фізічнага факультэта.

**І. БЕЛАОКІ,**
**старшыня спартыўнага клуба.**

## «СРЭБРА» ГАНДБАЛІСТАК

У фінальным туры чэмпіяната Беларусі па гандболу сярод жаночых каманд прымаў удзел квартэт мацнейшых калектываў, якія вызначыліся ў двух турах папярэдніх спаборніцтваў. Нашу вобласць на гэтым чэмпіянаце прадстаўляла каманда «Універсітэт» (трэнер — ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання М. Ф. Бура).

У стартавым матчы нашы дзяўчаты лёгка перамаглі каманду «Універсітэт» з Гомеля — 31:21, затым уступілі больш вопытным спартсменкам — камандзе Беларускага інстытута фізічнай культуры — 22:30, а ў апошняй гульні, у цікавым паядынку змаглі на апошніх мінутах атрымаць перамогу з перавагай у адзін мяч у зборнай каманды Магілёўскай вобласці — 17:16. Такім чынам, дзяўчаты заваявалі званне віцэ—чэмпіёнак Беларусі 1990 года. Вось каму былі ўручаны срэбраныя медалі: Наталлі Гівер, Іне Прэнзавай, Алене Сялагічны факультэт), Людміле Палудзе (факультэт правазнаўства), Ліліі Курсітак (начфак), Наталлі Рагозік (гістарычны факультэт) і Ірыне Сліж (падрыхтоўчае аддзяленне).

Пасля ўзнагароджвання каманд (чэмпіёнамі сталі студэнткі інстытута фізічнай культуры і Гомельскага універсітэта) М. Бура — трэнер, адзначыў, што ўся каманда выканала задачу, пастаўленую ёй. Вельмі добра гуляла ўратар І. Прэнзава, якая неаднойчы выратоўвала свае вароты ад, здавалася б, «мёртвых мячэй»; добрую тэхніку і тактыку гульні ў абароне паказалі Н. Гівер, В. Валюсь, усе сяміметровыя штрафныя кідкі рэалізавала Л. Палуда. Срэбраныя медалі каманды — несумненны поспех усіх.

Наперадзе новыя старты — удзел у X летняй Спартакіядзе Беларусі і ў фінальным турніры мацнейшых каманд ВНУ рэспублікі.

**А. СМАЛЯКОЎ,**
ст. выкладчык кафе...

